# ГАДЫ, ШТО ПТУШКІ…

**Піша вам выпускнік ВДПІ імя С.М. Кірава 1976 года, пісьменнік Мікалай МАРОЗ. Сёлета ў мяне шаноўны юбілей – 50 гадоў са дня заканчэння інстытута. Спадзяюся, што нехта адгукнецца – ці з маіх сакурснікаў, ці з тых, з кім я дзяліў і радасці, і нягоды ў сваёй 13-й (перад выпускам 43-й) групе. А, можа, хто з дзетак іх ці ўнукаў пачытае і адгукнецца, ці з мастацка-графічнага… Здорава было б! На ўсякі выпадак пакідаю ў рэдакцыі свой адрас і тэлефон.**



Некалькі слоў пра сябе. Нарадзіўся ў вёсцы, закончыў школу. Стаяў, як і многія, напэўна, на раздарожжы – кім быць. Аднакласніца прапанавала ехаць у Віцебск. Згадзіўся. Яна заваліла першы экзамен, а я стаў студэнтам 1 курса факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання. На курсе было ўсяго трое хлопцаў, але гэта мяне не бянтэжыла, наадварот, былі ўдвух з Уладзімірам Бяловым у групе як у ружоўніку! Пасля атрымання дыплома вёў беларускую мову ў школе ў Докшыцкім раёне, пісаў у газеты. У 1982-м пераехаў у Шуміліна, папярэдне здаўшы іспыты на права стаць карэспандэнтам раённай газеты… Аддаў друку 32 гады жыцця, 7 гадоў узначальваў шумілінскую газету «Герой працы». Выдаў сем кніжак прозы, з іх адна мне асабліва дарагая – раман «Папялішча – не тлен» (пра Обальскае падполле). Сёння ж хачу падзяліцца ўспамінамі пра студэнцкія гады.

...Вучыліся мы ў будынку былой мужчынскай духоўнай семінарыі па вуліцы Чэхава. Тут было цеснавата, круціліся з эцюднікамі, з чорнымі тубусамі пад пахамі будучыя мастакі – у шэрых кашулях з закасанымі рукавамі і ў пацёртых джынсах, моцна ляпалі дзвярыма, беглі на другі паверх нейкія музыканты і дзяўчаткі, учарашнія школьніцы ў кароценькіх спаднічках, – будучыя настаўніцы пачатковых класаў. І ўсё гэта з дзевяці да чатырох гадзін дня вірыла, мітусілася, надавала жыццю прыкметы сумбурнасці… На трэцім курсе нас перавялі ў новы корпус newінстытута па Маскоўскім праспекце. Але перад гэтым давялося папацець, наводзячы парадак – мылі, вымяталі цэментавы пыл, выносілі розны будаўнічы друз. Помню, як вылізвалі, даруйце за стыль, стартыўную залу. Затое, калі пачаліся заняткі, усе былі ад яе ў захапленні…

Адным з тых, хто прывіў мне любоў да матчынай мовы, быў Анатоль Канапелька, які выкладаў у нас дзіцячую літаратуру. На рэдкасць шчыры чалавек. Размаўляў па-беларуску не толькі на лекцыях, захоплена і ўзрушана чытаў свае вершы, калі наведваў наш студэнцкі інтэрнат. Я стоена слухаў паэта, яшчэ не ўсведамляючы, які след пакіне ён у маім жыцці. Анатоль Мікалаевіч прыахвоціўся ганяць нас, студэнтаў, па дробязях твораў, якія мы павінны былі прачытаць. Ён мог спытаць пра тое, якой масці быў сабака ў галоўнага героя, або чым займаўся сусед па дачы… На «пяцёрку» ў яго мала хто здаваў, але калі прыносіў хто (як і я) свае «опусы», каб мэтр даў ацэнку, ён рабіў гэта з вялікай ахвотай. Ніколі не ганьбіў, не прыніжаў, казаў проста: «Вось гэта, Мікола, выкінь у сметніцу, а тое, што ў цябе ў руках, – нясі ў газету. Цікавая рэч!». Так пашанцавала майму апавяданню «Шчасце рыбака».

Не магу абысці ўвагай нашага нязменнага дэкана Івана Георгіевіча Карнеева. Ён разам з выкладчыцай Верай Міхайлаўнай Мінаевай вёў землязнаўства. Уніклівы ва ўсім, з выгляду панурый, мала хто бачыў на яго твары ўсмешку, не надта гаваркі, затое надзіва міласэрны і дабрадушны чалавек. Ён гарой стаяў за кожнага студэнта (а іх на курсе было амаль восемдзясят душ), ведаў усіх у твар. Ніхто з нас не крыўдаваў, калі «зразаў» стыпендыю: ведалі – справядліва. Ён нас вучыў хадзіць з компасам па азімуту, арыентавацца на мясцовасці па розных прыкметах і аб'ектах, раіў не панікаваць, калі заблукаеш у лесе. Збіралі мы і гербарыі, былі за арнітолагаў, вывучалі анатомію чалавека. Усё гэта спатрэбілася не толькі ў школе, а і, перш за ўсё, у паўсядзённым жыцці…

Наша 13-я група была дружная. Староста Зоя Шыёнак – ціхмяная, не дужа гаваркая, але справу сваю ведала, заўсёды трымала руку на пульсе нашых праблем. Не было дня, каб не пабывала ў дэкана на аўдыенцыі. Былі ў нас свае «перастаркі» – Алена Варашэнь, Ідалія Пупіна, Тамара Раманава, яны недзе да вучобы працавалі. Пасля арміі быў Уладзімір Бялоў, астатнія – ад вучнёўскай лаўкі. Жылі цікава, весела, часта жартавалі, асаблівай ахвотніцай да жартаў была Ларыса Малануханіна, усё ў яе было да ладу. Жвавай, энергічнай была камсорг групы Зінаіда Свістунова. Самай, бадай, зграной, грацыяй лічылася ў нас Алена Іўлева (праз два гады стала Бялова, дамогся Уладзімір ад яе ўзаемнасці). Дарэчы, Уладзімір ведаў дзясяткі песень Уладзіміра Высоцкага, і гэта вельмі павышала яго аўтарытэт не толькі ў нашай групе. Помню, як сёння, тоненькі смяшок Надзеі Паўлоўскай, паважлівую стаpласць Тамары Раманавай, уседлівасць у вучобе Валянціны Маліноўскай, нейкую сумятлівасць, а мо і вечную боязь семінарскіх заняткаў Алены Варашэнь, ціхую, як мышку, Таццяну Данілаву…

Жыў я ў інтэрнаце па праспекце Фрунзэ, 31. Побач (Фрунзэ, 29) рассяліліся, акрамя іншых, і філолагі. Часта да іх заходзілі з хлопцамі. Тады ўжо, будучы на трэцім курсе, узгарэўся перайсці на філфак, але сябе асадзіў… Наш інтэрнат быў стары, калідоры гулкія, пакоі на 5 – 7 чалавек. Затое было весела. Жыў разам з хлопцамі з мастацка-графічнага факультэта. Віктар Мядзвецкі, старэйшы за мяне гады на два, усё садзіў мяне, каб пазіраваў. Казаў: «У цябе, Мікола, пластычны твар». І я сядзеў пакорліва, нават не чакаючы ад яго нейкіх падарункаў ці слоў падзякі… Гадоў восем назад у мастацкім музеі Віцебска пашчасціла ўбачыць выставу мастакоў Мядзвецкіх (бацька Віктар і два сыны). Уразіла. Кранула. Я быў узрушаны талентам таго, з кім дзяліў у студэнцкім пакоі шматок сала, які давала мне ў дарогу цётка, а ён у адказ садзіў мяне на крэсла і браў у рукі аловак, пэндзаль…

Часам так хочацца прайсціся па доўгіх універсітэцкіх калідорах, зазірнуць у аўдыторыі, дзе сядзеў чатыры гады, але, як пісаў некалі Максім Багдановіч, хаця і з іншай нагоды, «няма таго, што раньш было…». Бываць ва ўніверсітэце прыходзілася. Прыязджаў у літаратурны музей ВДУ імя П.М. Машэрава, сустракаўся са студэнтамі-філолагамі. Дарэчы, чатыры кнігі з сямі выдадзеных пакінуў у літаратурным музеі, дзве апошнія – «Вырак» і «Смага» – пакуль не давёз…

Няхай так, а ўсё адно тое, што засталося з сямідзясятых, калі быў малады, саграгае маё сэрца. Дзякуй усім, хто прычыніўся да майго юнацкага студэнцтва! І сябрам, і выкладчыкам, і проста добрым людзям, якія атулялі мяне любоўю і спагадай. Яшчэ разлічваю на нечаканую сустрэчу са сваёй маладосцю, калі можна перад кімсьці паспавядацца, адвесці душу ў згадках-успамінах… Буду ўдзячны адваротнай сувязі!



**На здымках:** (уверсе) Мікалай Мароз, (унізе) 43-я група. 1976 год.

**Фотаздымкі з асабістага архіву аўтара.**